# WANTED BY DICTATOR

## RED NOTICE STATE



BELPOL

SVIATLANA TSIKHANOUSKAYA OFFICE

# ЗМЕСТ

**УВОДЗІНЫ** ---------- 03

**ПРАВАВЫЯ АЦЭНКІ І ЭКСПЕРТНЫЯ КАМЭНТАРЫ** ---------- 04

**БЕЛАРУСЬ: ДЗЯРЖАВА СІСТЭМНЫХ РЭПРЭСІЙ** ---------- 06

Маштаб палітычна матываванага пераследу ---------- 06

Палітычныя зняволеныя і ўмовы ўтрымання ---------- 07

Пашырэнне рэпрэсіўных механізмаў ---------- 07

Рэпрэсіі ў дачыненні да прафесійных груп ---------- 07

**ТРАНСНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ РЭПРЭСІІ І ЭМІГРАЦЫЯ** ---------- 08

Завочныя суды (trials in absentia) ---------- 08

Прымусовыя дэпартацыі ---------- 09

Ануляванне пашпартоў дэпартаваных ---------- 09

Расследаванне Міжнароднага крымінальнага суда ----------10

Без Чырвонага апавяшчэння: як Беларусь дамагаецца затрыманняў і экстрадыцый па ўсім свеце ---------- 10

**ІНТЭРПОЛ І БЕЛАРУСЬ: СІСТЭМА І ЗЛОЎЖЫВАННІ** ---------- 14

Транснацыянальныя рэпрэсіі праз Інтэрпол: як працуе сістэма і як ёю маніпулююць ---------- 14

Як звязацца з Інтэрполам і абараніць свае правы: кіраўніцтва для беларусаў і беларусак ---------- 15

Выкарыстанне абвінавачанняў у экстрэмізме, тэрарызме, махлярстве ці эканамічных злачынствах як прыкрыццё палітычнага пераследу: практыка ------ 15

Інтэрпол не адказвае заўтра: рэальныя тэрміны разгляду зваротаў ---------- 22

Без права ведаць: чаму Інтэрпол не раскрывае дадзеныя аб пераследуемых беларусах і беларусках ---------- 23

Чырвоныя апавяшчэнні і шэрыя зоны: межы кантролю ў сістэме Інтэрпола ------ 25

Неабходнасць паўторнага абмежавання доступу рэжыму А. Лукашэнкі да механізмаў Інтэрпола ---------- 27

**ХТО ПЕРАСЛЕДУЕ БЕЛАРУСАЎ І БЕЛАРУСАК ЦЯПЕР? НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ЦЭНТРАЛЬНАЕ БЮРО ІНТЭРПОЛ БЕЛАРУСІ** ---------- 28

**ВЫСНОВЫ** ---------- 30

**CALL TO ACTION** ---------- 32

# УВОДЗІНЫ

Гэты дакумент падрыхтаваны **Офісам Святланы Ціханоўскай** у супрацоўніцтве з ініцыятывай **BELPOL**, якая аб'ядноўвае былых супрацоўнікаў праваахоўных органаў Рэспублікі Беларусь, якія выступілі супраць палітычных рэпрэсій і злоўжыванняў уладай, а таксама пры садзейнічанні ініцыятывы **«Кіберпартызаны»** — дэцэнтралізаванай групы беларускіх хакер-актывістаў, якая дакументуе дзейнасць беларускіх сілавых структур і раскрывае факты парушэнняў правоў чалавека і злоўжыванняў дзяржаўнымі інстытутамі. Дакумент таксама заснаваны на экспертным укладзе незалежных спецыялістаў у галіне міжнароднага права, правоў чалавека, міжнароднага паліцэйскага супрацоўніцтва і супрацьдзеяння транснацыянальным рэпрэсіям. У падрыхтоўцы і экспертным абмеркаванні дакумента прынялі ўдзел у тым ліку ўдзел адвакат і былы кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Алесь Міхалевіч, а таксама прадстаўнікі арганізацый-партнёраў, эксперты і эксперткі, якія маюць шматгадовы практычны вопыт суправаджэння спраў асоб, якія падверглісь палітычна матываванаму пераследу.

Мэтай гэтага дакумента з'яўляецца аналіз існуючых механізмаў абмену інфармацыяй у рамках Міжнароднай арганізацыі крымінальнай паліцыі (далей — «Інтэрпол»), выяўленне рызык іх выкарыстання ў палітычных мэтах, а таксама выпрацоўка практычных рэкамендацый, накіраваных на павышэнне эфектыўнасці сістэмы пры адначасовым умацаванні гарантый абароны правоў чалавека. Асаблівая ўвага надаецца праблеме злоўжывання інструментамі Інтэрпола з боку аўтарытарных рэжымаў для пераследу палітычных апанентаў, праваабаронцаў, журналістаў, прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і ўдзельнікаў дэмакратычных рухаў, якія знаходзяцца па-за межамі краіны паходжання.

У апошнія гады Беларусь стала адным з найбольш паказальных прыкладаў выкарыстання механізмаў міжнароднага супрацоўніцтва ў праваахоўнай сферы для аказання націску на асоб, якія пераследуюцца па палітычных матывах. Пасля падзеяў 2020 года сотні тысяч грамадзянаў Беларусі былі вымушаныя пакінуць краіну з-за пагрозы крымінальнага пераследу, адвольных затрыманняў, катаванняў і іншых сур'ёзных парушэнняў правоў чалавека. Адначасова назіраецца актывізацыя спроб выкарыстання міжнародных прававых і паліцэйскіх механізмаў для працягу пераследу такіх асоб за межамі Беларусі.

У першай частцы дакумента разглядаюцца асноўныя прынцыпы функцыянавання сістэмы апрацоўкі персанальных дадзеных Інтэрполам, уключаючы механізмы публікацыі апавяшчэнняў (Notices) і распаўсюджвання дыфузій (Diffusions), а таксама дзейныя працэдуры кантролю за выкананнем Статута Інтэрпола і міжнародных стандартаў у галіне правоў чалавека. У другой частцы падрабязна аналізуюцца праблемы, якія ўзнікаюць з прычыны злоўжывання дадзенымі механізмамі з боку рэпрэсіўных рэжымаў, у тым ліку практыка палітычна матываваных запытаў, недастатковая празрыстасць асобных працэдур і існуючыя рызыкі для асоб, якія знаходзяцца пад міжнароднай абаронай або вымушаных пакінуць свае краіны па палітычных прычынах. У заключнай частцы прадстаўлены канкрэтныя рэкамендацыі, накіраваныя на ўдасканаленне механізмаў праверкі інфармацыі, павышэнне празрыстасці працэдур і ўмацаванне гарантый абароны асоб ад палітычна матываванага пераследу.

Аўтары дакумента зыходзяць з таго, што эфектыўная барацьба з міжнароднай злачыннасцю і забеспячэнне міжнароднай бяспекі немагчымыя без даверу да механізмаў Інтэрпола. Такі давер падрываецца, калі асобныя дзяржавы выкарыстоўваюць каналы міжнароднага паліцэйскага супрацоўніцтва для пераследу асоб па палітычных матывах, маскіруючы такія справы пад агульнакрымінальныя або эканамічныя злачынствы, што супярэчыць артыкулу 3 Статута Інтэрпола і яго асноватворнаму прынцыпу палітычнага нейтралітэту. Захаванне даверу да сістэмы Інтэрпола магчыма толькі пры ўмове строгага захавання Статута Інтэрпола, Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах і іншых міжнародных стандартаў у галіне абароны правоў чалавека. Прапанаваныя рэкамендацыі накіраваны не на абмежаванне магчымасцей міжнароднага паліцэйскага супрацоўніцтва, а на ўмацаванне яго легітымнасці, эфектыўнасці і ўстойлівасці да злоўжыванняў з боку дзяржаў, якія выкарыстоўваюць праваахоўныя механізмы ў мэтах палітычнага пераследу.

# ПРАВАВЫЯ АЦЭНКІ І ЭКСПЕРТНЫЯ КАМЭНТАРЫ



**Леанід Марозаў**

Дарадца Святланы Ціханоўскай па прававых пытаннях, кіраўнік Юрыдычнага дэпартамента, дактарант

«Рэжым Лукашэнкі даўно выйшаў за межы нацыянальных рэпрэсій і паслядоўна развівае практыку транснацыянальнага пераследу сваіх апанентаў. За апошнія гады мы назіралі выпадкі затрыманняў, пагрозаў экстрадыцыі і іншых формаў ціску на грамадзянаў Беларусі ў Польшчы, Літве, Славакіі, Арменіі, Грузіі, Турцыі, В'етнаме, Італіі, Аргенціне і іншых краінах. Ахвярамі такіх дзеянняў становяцца журналісты, праваабаронцы, прадстаўнікі дэмакратычных сілаў, былыя палітычныя зняволеныя і звычайныя грамадзяне, якія былі вымушаныя пакінуць Беларусь праз палітычна матываваны пераслед.

Выкарыстанне міжнародных праваахоўных механізмаў для палявання на палітычных апанентаў мусіць атрымліваць жорсткую міжнародную рэакцыю. Службовыя асобы, супрацоўнікі сілавых структур і іншыя прадстаўнікі рэжыму, якія маюць дачыненне да арганізацыі транснацыянальных рэпрэсій і злоўжывання механізмамі міжнароднага супрацоўніцтва, павінны станавіцца аб'ектам персанальных санкцый і іншых мер адказнасці. Беспакаранасць падобных дзеянняў уяўляе пагрозу не толькі для беларусаў і беларусак, але і для самой сістэмы міжнароднага правасуддзя, заснаванай на прынцыпах вяршэнства права і павагі правоў чалавека».



**Уладзімір Жыгар**

Аналітык у сферы бяспекі Усходнееўрапейскага рэгіёна, публічны прадстаўнік арганізацыі «BELPOL»

«За апошнія гады, паводле розных ацэнак, з Беларусі выехалі ад 800 тысячаў да аднаго мільёна грамадзянаў. Многія былі вымушаныя пакінуць краіну, ратуючыся ад палітычна матываваных рэпрэсіяў, якія пасля 2020 года набылі беспрэцэдэнтны маштаб. У дачыненні да тысячаў людзей заведзеныя крымінальныя справы паводле палітычных матываў, многія былі завочна асуджаныя. Аднак небяспека, якая сыходзіць ад рэжыму Лукашэнкі, захоўваецца для ўсіх, хто апынуўся ў полі ягонай увагі.

Выкарыстоўваючы ўсе магчымасці, рэжым Лукашэнкі паслядоўна і сістэмна пераследуе тых, хто адважыўся праявіць грамадзянскае непадпарадкаванне ў 2020 годзе. Адным з ключавых элементаў гэтай сістэмы з'яўляецца Нацыянальнае цэнтральнае бюро Інтэрпола Беларусі, якое ўваходзіць у структуру Міністэрства ўнутраных спраў. Маніпулюючы дакументамі і доказамі, карыстаючыся абмежаванай дасведчанасцю міжнародных партнёраў аб тым, што адбываецца ўнутры краіны, беларускі рэжым нярэдка атрымлівае крытычна важную інфармацыю аб сваіх палітычных апанентах і іншых асобах, якія пакінулі Беларусь.

Пасля пачатку поўнамаштабнай вайны супраць Украіны, рэпрэсіі распаўсюдзіліся і на тых, хто адкрыта выступіў супраць вайны. Сёння небяспека пагражае не толькі палітыкам і вядомым актывістам. Пад ударам аказваюцца

журналісты, праваабаронцы, спартсмены, валанцёры, добраахвотнікі, а таксама іх сем'і. Ніхто з тых, каго рэжым лічыць нелаяльным, не можа пачувацца ў поўнай бяспецы.

Інтэрпол стварауся для барацьбы з міжнароднай злачыннасцю. Ён не можа і не павінен станавіцца інструментам у руках дыктатуры, які выкарыстоўваецца для транснацыянальнага пераследу палітычных апанентаў».



**Алесь Міхалевіч**

Доктар навук, грамадскі і палітычны дзеяч, адвакат

«Я хацеў бы адзначыць, што нядаўняя рэзалюцыя Еўрапарламента аб супрацьдзеянні транснацыянальным рэпрэсіям (ад 16 чэрвеня 2026 года) прайшла незаўважанай у СМІ, хоць яна зрабіла значны крок у прызнанні злоўжывання механізмамі Інтэрпола з боку рэжыму Лукашэнкі. Рэзалюцыя прама ўказала на выкарыстанне Беларуссю сістэмы чырвоных паведамленняў Інтэрпола для пераследу палітычных апанентаў у выгнанні. Тое, што юрысты і праваабаронцы дакументавалі гадамі, упершыню замацавана як пазіцыя ўладаў Еўрапейскага саюза.

Для мяне, як адваката, які абараняе беларусаў, якія вымушана эмігравалі, гэта дае новы пункт апоры. Ва ўсіх дзяржавах-сябрах ЕЗ з'явілася інстытуцыйная падстава падыходзіць да беларускіх вышуковых ордэраў з падвышанай асцярожнасцю. Спадзяюся, што адбудуцца пэўныя зрухі ў тым жа напрамку і з боку органаў Інтэрпола. Аднак ацэньваць уплыў на практыку канкрэтных рашэнняў можна будзе яшчэ не хутка, думаю прыкладна праз год».

# БЕЛАРУСЬ: ДЗЯРЖАВА СІСТЭМНЫХ РЭПРЭСІЙ

З моманту прэзідэнцкіх выбараў 2020 года сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі застаецца ўстойліва рэпрэсіўнай. Нягледзячы на працягласць крызісу, сістэмных паляпшэнняў не адбылося. Наадварот, рэпрэсіі набылі інстытуцыяналізаваны характар і рэалізуюцца праз крымінальны і адміністрацыйны пераслед, а таксама праз пашыральнае прымяненне заканадаўства аб «экстрэмізме» і «тэрарызме».

Праваабарончыя арганізацыі, уключаючы **Праваабарончы цэнтр «Вясна»**, фіксуюць бесперапынны характар палітычна матываваных затрыманняў, крымінальных справаў і ціску на грамадзянскую супольнасць. Маштаб і ўстойлівасць гэтых практык сведчаць аб сістэмным характары рэпрэсій.

## МАШТАБ ПАЛІТЫЧНА МАТЫВАВАНАГА ПЕРАСЛЕДУ

З 2020 года ў Беларусі зафіксаваны масавыя палітычна матываваныя рэпрэсіі:

- у 2020 годзе — больш за 33 000 затрыманняў;
- у 2021–2024 гадах — штогод ад 6 300 да 6 550 затрыманняў;
- у 2025 годзе — не менш за 1 254 асуджаных па палітычна матываваных крымінальных справах;
- да чэрвеня 2026 года — не менш за 500 чалавек падвергліся крымінальнаму пераследу.

У цэлым, з 2020 года больш за 65 000 чалавек падвергліся палітычна матываваным затрыманням і наступнаму пераследу. За гэты ж перыяд вынесена не менш за 8590 абвінавальных прысудаў па палітычна матываваных справах.




RED NOTICE STATE

WANTED BY DICTATOR

# ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ І ЎМОВЫ ЎТРЫМАННЯ

Па стане на канец чэрвеня 2026 года ў Беларусі налічваецца 859 палітычных вязняў, у тым ліку 117 жанчын. З мая 2020 года гэты статус быў прысвоены 4675 асобам, пры гэтым больш за 3867 чалавек ужо былі вызваленыя.

Умовы ўтрымання застаюцца вельмі цяжкімі. Частка палітычных зняволеных утрымліваецца ў рэжыме інкамунікада — без перапіскі, тэлефоннай сувязі, доступу да адвакатаў і без інфармацыі для сваякоў аб стане іх здароўя.

Праваабаронцы працягваюць дакументаваць выпадкі катаванняў, жорсткага і зневажальнага абыходжання, а таксама ціск у месцах пазбаўлення волі. У красавіку 2026 года эксперты ААН **выказалі сур'ёзную занепакоенасць** паведамленнямі аб катаваннях, працяглай ізаляцыі, спробах самагубстваў, смерцях у зняволенні і рэпрэсіях супраць зняволеных, указаўшы на магчымыя грубыя парушэнні міжнароднага права.

Асобна адзначаецца, што не менш за 176 палітычных зняволеных знаходзяцца ва ўразлівым становішчы па стане здароўя або іншым крытэрам рызыкі.

З 2020 года задакументавана як мінімум 31 смерць, звязаная з палітычным пераследам, уключаючы не менш як 9 смерцяў палітычных зняволеных у месцах пазбаўлення волі. Яшчэ 6 выпадкаў разглядаюцца як патэнцыйна звязаныя з дзеяннямі ўладаў.

# ПАШЫРЭННЕ РЭПРЭСІЎНЫХ МЕХАНІЗМАЎ

Рэжым А. Лукашэнкі сістэматычна выкарыстоўвае заканадаўства аб «экстрэмізме» і «тэрарызме» як інструмент палітычнага ціску і падаўлення іншадумства.

Па стане на чэрвень 2026 года:

- 6 745 чалавек уключаны ў спіс «экстрэмісцкай дзейнасці»;
- 1 628 чалавек — у спіс «тэрарыстычнай дзейнасці»;
- каля 373 арганізацый і ініцыятыў прызнаны «экстрэмісцкімі фарміраваннямі»;
- больш за 9 350 матэрыялаў уключаны ў пералік «экстрэмісцкіх».

З 2020 года таксама ліквідавана не менш як 2 044 няўрадавыя арганізацыі, што фактычна азначае дэмантаж незалежнага грамадзянскага сектара.

# РЭПРЭСІІ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ПРАФЕСІЙНЫХ ГРУП

Палітычны ціск распаўсюджваецца на розныя прафесійныя катэгорыі, у тым ліку журналістаў, юрыстаў і праваабаронцаў.

Па стане на чэрвень 2026 года:

- не менш за 21 журналіста знаходзяцца ў зняволенні;
- каля 60 медыяарганізацый прызнаны «экстрэмісцкімі фармаваннямі»;
- 33 журналісты ўключаны ў спіс «экстрэмістаў», 12 — у спіс «тэрарыстаў».

Акрамя таго, як мінімум 7 адвакатаў і 2 праваабаронцы былі асуджаныя да працяглых тэрмінаў пазбаўлення волі ў сувязі з прафесійнай дзейнасцю, адзін з праваабаронцаў на дадзены момант знаходзіцца ў СІЗА.

Паводле ацэнак Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, «з 2020 года да 300 000 чалавек былі вымушаныя пакінуць Беларусь у выніку скаардынаванай кампаніі гвалту і рэпрэсій, наўмысна скіраваных супраць тых, хто выступае — ці ўспрымаецца як такі — супраць урада або выказвае крытычнае ці незалежнае меркаванне».[01] Група незалежных экспертаў ААН па Беларусі характарызуе тое, што адбываецца, як «скаардынаваную кампанію гвалту і жорсткага абыходжання», якая з'яўляецца «часткай дыскрымінацыйнай палітыкі, скіраванай на сістэматычны пераслед і запалохванне любога чалавека і закрыццё любой грамадзянскай ці палітычнай арганізацыі», нязгодных з урадам А. Лукашэнкі.[02]

Але рэпрэсіі не заканчваюцца на мяжы. Парламенцкая асамблея Рады Еўропы асудзіла транснацыянальныя рэпрэсіі — пераслед дзяржавай сваіх крытыкаў за мяжой — як нарастаючую пагрозу правам чалавека і нагадала, што краіны, якія прымаюць, абавязаныя абараняць такіх людзей.[03] Еўрапейскі парламент запатрабаваў неадкладных захадаў супраць транснацыянальных рэпрэсій беларускага рэжыму — у тым ліку супраць злоўжывання механізмамі Інтэрпола — і абароны беларусаў у выгнанні.[04] На жаль, рэжым А. Лукашэнкі пераследуе тых, хто з'ехаў усё больш актыўна, у тым ліку праз каналы міжнароднага супрацоўніцтва па крымінальных справах, такія як Інтэрпол. Гэтая сістэма трымаецца на некалькіх узаемазвязаных практыках: завочных судах, прымусовых дэпартацыях і ануляванні пашпартоў высланых. Сёння гэтыя дзеянні — прадмет расследавання Міжнароднага крымінальнага суда.

## ЗАВОЧНЫЯ СУДЫ (TRIALS IN ABSENTIA)

З 2022 года ў Беларусі можна асудзіць чалавека завочна — у рамках так званай «спецыяльнай вытворчасці» ў дачыненні да тых, хто знаходзіцца за мяжой. Па дадзеных Праваабарончага цэнтру «Вясна», да канца 2025 года было вядома не менш чым пра 200 такіх працэсаў; толькі за 2025 год завочна асуджаныя 30 чалавек.[05] Завочны прысуд азначае працяглы тэрмін пазбаўлення волі і канфіскацыю маёмасці, а з 2023 года — яшчэ і магчымасць пазбавіць чалавека грамадзянства за «экстрэмізм».[06] Эксперты ААН устрывожаныя маштабам гэтай практыкі: паводле іх ацэнкі, «беларускае заканадаўства аб завочных судовых працэсах ігнаруе асноўныя гарантыі справядлівага судовага разбору, замацаваныя ў Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах, ратыфікаваным Беларуссю».[07]

Менавіта завочныя прысуды рэжым спрабуе выкарыстоўваць для міжнароднага вышуку тых, хто з'ехаў. Па словах юрыста Алеся Міхалевіча, «афіцыйны Мінск лічыць, што задзейнічанне каналаў Інтэрпола на падставе такога судовага рашэння нейкім чынам дапаможа ім».[08] Еўрапейскі парламент назваў завочны пераслед беларусаў за мірную дзейнасць за мяжой прамым парушэннем суверэнітэту краін ЕС і заклікаў дзяржавы ігнараваць запыты па каналах



01 Даклад Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах чалавека «Становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх», дакумент ААН A/HRC/55/61 (15 сакавіка 2024 г.), п. 47.

02 Даклад Групы незалежных экспертаў аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі «Устараненне прабелаў у забеспячэнні адказнасці за парушэнні правоў чалавека і звязаныя з імі злачынствы ў Беларусі», дакумент ААН A/HRC/60/CRP.1 (4 верасня 2025 г.), п. 16.

03 Парламенцкая асамблея Рады Еўропы, Рэзалюцыя 2509 (2023) «Транснацыянальныя рэпрэсіі як расце пагроза вяршэнству права і правам чалавека» (прынята 23 чэрвеня 2023 г.), даступна на адрас: https://pace.coe.int/en/files/32999

04 Рэзалюцыя Еўрапейскага парламента ад 22 кастрычніка 2025 г. аб сітуацыі ў Беларусі праз пяць гадоў пасля сфальсіфікаваных прэзідэнцкіх выбараў, P10_TA(2025)0249, даступна па адрасе: https://www.europarl.europa.eu/doceo/document/TA-10-4025-0.

05 Праваабарончы цэнтр «Вясна», «Even abroad, you remain within the reach of the state». How Belarusians were persecuted outside the country in 2025», даступна па адрасе: https://spring96.org/en/news/119364

06 Упраўленне Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах чалавека, «Беларусь: эксперты ААН асуджаюць выгнанне грамадзян і папярэджваюць аб рызыцы безграмадзянства» (8 снежня 2025 г.), даступна па адрасе: https://www.ohchr.org/be/press-releases/2025/12/belarus-un-experts-denounce-expulsion-citizens-warn-about-risk-statelessness

07 Упраўленне Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах чалавека, «Беларусь: эксперты ААН занепакоеныя шырокім прымяненнем завочных судовых працэсаў» (22 студзеня 2025 г.), даступна па адрасе: https://www.ohchr.org/be/press-releases/2025/01/belarus-un-experts-alarmed-about-widespread-absentia-trials

08 Алесь Міхалевіч, «Завочныя суды над тымі, хто з'ехаў — аб новай ініцыятыве беларускіх уладаў», даступна па адрасе: https://michalevic.org/news/trial-in-absentia/zaochno-sudit-uexavshix-o-novoj-iniczziative-vlastej-belarusi

Інтэрпола, накіраваныя на выдачу палітычных апанентаў А. Лукашэнкі.[09]



## ПРЫМУСОВЫЯ ДЭПАРТАЦЫІ

З 2025 года вызваленне палітвязняў, як правіла, прыводзіла да іх гвалтоўнай высылкі з краіны. У чэрвені 2025 года 14 вызваленых вывезлі ў Літву.[10] 11 верасня 2025 года па дамоўленасці з ЗША Беларусь вызваліла і даставіла да літоўскай мяжы 52 чалавекі. У снежні 2025 года з краіны выслалі яшчэ адну групу вызваленых, у тым ліку лаўрэата Нобелеўскай прэміі міру Алеся Бяляцкага.

Эксперты ААН заявілі, што «высылка краінай уласных грамадзян і адвольная канфіскацыя іх дакументаў, якія пасведчваюць асобу, парушаюць шэраг правоў чалавека»: у 14 з 52 высланых у верасні 2025 года адабралі пашпарты.[11] Група незалежных экспертаў ААН у дакладзе за люты 2026 года прыйшла да высновы, што высылка як умова вызвалення — грубае парушэнне правоў чалавека, і заклікала абараніць беларусаў і беларусак у выгнанні і прыцягнуць вінаватых да адказнасці.[12] Многія дэпартаваныя апынуліся за мяжой без дакументаў і прававога статусу — а значыць, без нармальнага доступу да працы, жылля і медыцынскай дапамогі.[13]

## АНУЛЯВАННЕ ПАШПАРТОЎ ДЭПАРТАВАНЫХ

Прымусова дэпартаваных былых палітычных вязняў мэтанакіравана пакідаюць без дакументаў. З верасня 2023 года беларускія консульствы не выдаюць і не мяняюць пашпарты — тым, хто з'ехаў, прапануецца вяртацца па дакументы ў Беларусь.[14] А ў сакавіку 2026 года «Вясна» паведаміла, што пашпарты экс-палітвязняў, высланых у верасні і снежні 2025 года, анулявыя — гэта практычна ўсе, хто выехаў з дакументамі, каля 20-25 чалавек.[15] На думку юрыстаў «Вясны», пашпарты заднім чыслом прызнаныя «непрыдатнымі для выкарыстання»: так улады афармляюць высылку, якая адбылася, і пазбаўляюць людзей магчымасці вярнуцца дадому.[16]

Група незалежных экспертаў ААН рашуча асудзіла гэтую меру: яна прынятая без прававых падстаў і парушае базавыя правы чалавека — свабоду перамяшчэння, права на ўезд ва ўласную краіну, забарону дыскрымінацыі.[17] Эксперты таксама папярэджваюць, што падобныя меры могуць пакінуць людзей зусім без грамадзянства.[18] Тое, што адбываецца, таксама называюць «працягам рэпрэсій — проста ў іншай форме і ўжо за межамі краіны».[19]

09 Рэзалюцыя Еўрапейскага парламента ад 3 красавіка 2025 г. аб непасрэднай рызыцы далейшых рэпрэсій з боку рэжыму Лукашэнкі ў Беларусі — пагрозах з боку Следчага камітэта, P10_TA(2025)0063, пп. 3–4, даступна па адрасе: https://www.europarl.europa.eu/doceo/document/TA-10-2025-0063_EN.html

10 ПЦ Вясна. Сяргей Ціханоўскі і яшчэ 13 палітвязняў на волі, даступна на адрас: https://spring96.org/ru/news/118170

11 «Зеркало», «Улады анулююць пашпарты экс-палітвязняў, якіх пасля вызвалення дэпартавалі з Беларусі, — «Вясна» (30 сакавіка 2026 г.), даступна на адрас: https://news.zerkalo.io/life/123928.html

12 Упраўленне Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах чалавека, «Belarus: UN experts welcome prisoner releases, but warn that forced expulsion and deportation violate human rights» (27 лютага 2026 г.), даступна па адрасе: https://www.ohchr.org/en/press-releases/2026/02/belarus-un-experts-welcome-prisoner-releases-warn-forced-expulsion-and ; Даклад Групы незалежных экспертаў аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі, дакумент ААН A/HRC/61/57

13 «Наша Ніва», «Дэпартаваныя палітвязні затрымаліся паміж пеклам і зямлёй» (лістапад 2025 г.), перадрук даступны на адрас: https://udf.name/news/main_news/284826-deportirovannye-politzakljuchennye-zastrjali-mezhdu

14 Упраўленне Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах чалавека, «Беларусь: прэзідэнцкі ўказ, які пазбаўляе беларусаў за мяжой консульскіх паслуг, ставіць іх ва ўразлівае становішча» (верасень 2023 г.), даступна па адрасе: https://www.ohchr.org/be/press-releases/2023/09/belarus-presidential-decree-denying-consular-services-puts-belarusians

15 Праваабарончы цэнтр «Вясна», паведамленне аб анулянні пашпартоў дэпартаваных экс-палітвязняў (30 сакавіка 2026 г.), даступна на адрас: https://spring96.org/be/news/119931 ; «Зеркало» (30 сакавіка 2026 г.), гл. зноску 12; «Хартыя'97», «Рэжым Лукашэнкі ануляваў пашпарты як мінімум 16 экс-палітвязням» (1 красавіка 2026 г.), даступна на адрас: https://charter97.org/be/news/2026/4/1/679110

16 Тамсама.

17 Упраўленне Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах чалавека, «Беларусь: эксперты ААН асуджаюць рашэнне ўрада анулюваць пашпарты выгнаных апанентаў» (20 красавіка 2026 г.), даступна па адрасе: https://www.ohchr.org/be/press-releases/2026/04/belarus-un-experts-condemn-government-move-invalidate-passports-exiled

18 Упраўленне Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах чалавека, «Беларусь: эксперты ААН асуджаюць выгнанне грамадзян і папярэджваюць аб рызыцы безграмадзянства» (8 снежня 2025 г.), даступна па адрасе: https://www.ohchr.org/be/press-releases/2025/12/belarus-un-experts-denounce-expulsion-citizens-warn-about-risk-statelessness

19 «Зеркало» (30 сакавіка 2026 г.), гл. зноску 11.

## РАССЛЕДАВАННЕ МІЖНАРОДНАГА КРЫМІНАЛЬНАГА СУДА

У верасні 2024 года Літва звярнулася да Пракурора Міжнароднага крымінальнага суда, заявіўшы, што дэпартацыя і пераслед беларусаў і беларусак — гэта злачынствы супраць чалавечнасці, частка якіх здзейснена на тэрыторыі Літвы.[20] 12 сакавіка 2026 года Офіс Пракурора МУС, завяршыўшы папярэдняе вывучэнне сітуацыі, адкрыў расследаванне: паводле яго высноў, ёсць разумныя падставы меркаваць, што дэпартацыі і пераслед па палітычных матывах здзяйсняліся «ў рамках шырокамаштабнага і сістэматычнага нападу на грамадзянскае насельніцтва» і заахвочваліся або ўхваляліся на самым высокім дзяржаўным узроўні Беларусі.[21]

Завочныя прысуды без справядлівага суда, гвалтоўныя высылкі і ануляванне пашпартоў — элементы адной дзяржаўнай палітыкі, якую механізмы ААН і Пракурор МУС разглядаюць як магчымыя злачынствы супраць чалавечнасці. Таму запыты Беларусі па каналах Інтэрпола ў дачыненні да тых, хто з'ехаў, трэба па змаўчанні лічыць палітычна матываванымі, гэта значыць несумяшчальнымі з артыкулам 3 Статута Інтэрпола, які забараняе арганізацыі любое ўмяшанне палітычнага характару.

## БЕЗ ЧЫРВОНАГА АПАВЯШЧЭННЯ: ЯК БЕЛАРУСЬ ДАМАГАЕЦЦА ЗАТРЫМАННЯЎ І ЭКСТРАДЫЦЫЙ ПА ЎСІМ СВЕЦЕ

Нягледзячы на значную ўвагу, якая надаецца злоўжыванню механізмамі Інтэрпола, практыка паказвае, што міжнародны пераслед палітычных апанентаў не абмяжоўваецца выкарыстаннем апавяшчэнняў і запытаў праз Інтэрпол.

У шэрагу выпадкаў рэжым А. Лукашэнкі звяртаецца да іншых інструментаў міжнароднага супрацоўніцтва ў крымінальна-прававой сферы, уключаючы Канвенцыю аб прававой дапамозе і прававых адносінах па грамадзянскіх, сямейных і крымінальных справах дзяржаў — удзельніц СНД (Мінская канвенцыя 1993 года і Кішынёўская канвенцыя 2002 года),[22] а таксама двухбаковыя дамовы аб прававой дапамозе і выдачы, заключаныя Беларуссю з замежнымі дзяржавамі.

Выкарыстанне такіх механізмаў дазваляе рэжыму А. Лукашэнкі дамагацца затрымання асобаў, абвешчаных у вышук, ініцыяваць працэдуры экстрадыцыі і накіроўваць запыты аб міжнароднай прававой дапамозе нават у тых выпадках, калі не задзейнічаныя каналы Інтэрпола або калі адпаведныя паведамленні былі адхіленыя ці выдаленыя Інтэрполам праз іх палітычны характар. На практыцы гэта стварае дадатковыя рызыкі для беларусаў і беларусак, якія знаходзяцца за мяжой.

Далей прыведзены прыклады спраў, якія дэманструюць, якім чынам працягваецца выкарыстанне механізмаў міжнароднага крымінальна-прававога супрацоўніцтва для пераследу палітычных апанентаў за межамі краіны нават пры адсутнасці Чырвонага апавяшчэння Інтэрпола.





20 Заява Пракурора МУС Карыма А.А. Хана ў сувязі з атрыманнем звароту Літоўскай Рэспублікі (30 верасня 2024 г.), даступна па адрасе: https://www.icc-cpi.int/news/statement-icc-prosecutor-karim-aa-khan-kc-receipt-referral-republic-lithuania

21 Міжнародны крымінальны суд, «ICC Office of the Prosecutor» (12 сакавіка 2026 г.), прадстаўлены па адрасе: https://www.icc-cpi.int/news/icc-office-prosecutor-concludes-preliminary-examinations-venezuela-ii-and-lithuania/belarus ; Офіс Пракурора МУС, «Situation in the Republic of Lithuania / Republic of Belarus: Summary of Findings», даступна па адрасе: https://www.icc-cpi.int/sites/default/files/2026-03/Summary-of-findings-Situation-Lithuania-B

22 Канвенцыя аб прававой дапамозе і прававых адносінах па грамадзянскіх, сямейных і крымінальных справах, заключаная ў г. Мінску 22 студзеня 1993 г. (Мінская канвенцыя): https://eccis.org/document/192

# СПРАВА № 1

Аддзел аператыўна-следчы

Спадарыня Дзіяна Маісеенка, беларуская актывістка, звязаная з пратэстным рухам пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года ў Беларусі, была затрымана ў Арменіі ў 2024 годзе пры перасячэнні сухапутнай мяжы з Грузіі па запыце Беларусі.

Беларусь дабівалася яе экстрадыцыі ў сувязі з крымінальнымі абвінавачваннямі, звязанымі з яе меркаваным удзелам у пратэстах пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года. Па словах Маісеенкі, да свайго затрымання за мяжой яна не ведала аб узбуджэнні супраць яе крымінальнай справы ў Беларусі. Да затрымання Маісеенка пражывала ў Грузіі, пакінуўшы Беларусь з-за боязі палітычнага пераследу.

Пасля затрымання спадарыні Маісеенкі ў Арменіі прадстаўнікі беларускіх дэмакратычных сіл і Офіса Святланы Ціханоўскай умяшаліся ў сітуацыю і паінфармавалі армянскія ўлады аб рызыках экстрадыцыі спадарыні Маісеенкі ў Беларусь.

У выніку армянскія ўлады вызвалілі спадарыню Маісеенку,[23] і пасля яна падала прашэнне аб прадастаўленні палітычнага прытулку.

23 Civilnet, «Беларускі апазіцыйны актывіст вызвалены пасля кароткачасовага затрымання ў Арменіі» (3 верасня 2024 г.), даступна па адрасе: https://civilnet.am/en/news/795729.

Завершана

Арх. №

Архівавана «_____» ____________________ 20___ г.

20

# СПРАВА № 2

Аддзел апэратыўна-сьледчы

У дачыненні да сп. Дзмітрыя Плескачова, беларускага грамадзянскага і апазіцыйнага актывіста, удзельніка пратэстаў супраць рэжыму Лукашэнкі пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года ў Беларусі, быў пададзены запыт аб экстрадыцыі, ініцыяваны Беларуссю. Беларусь дамагалася ягонай экстрадыцыі ў сувязі з крымінальным разглядам, які беларускія дэмакратычныя сілы лічылі палітычна матываваным.

28 лістапада 2024 года Акруговы суд у Познані адхіліў запыт аб выдачы, пададзены Беларуссю ў дачыненні да сп. Плескачова. Польскі суд прыйшоў да высновы, што беларускі крымінальны пераслед у дачыненні да яго носіць палітычна матываваны характар і што яго выдача падвергне яго сур'ёзнай рызыцы палітычна матываваных пераследаў, несправядлівага судовага разбору і парушэнняў яго асноўных правоў у Беларусі. Падчас разбору па справе аб экстрадыцыі прадстаўнік Генеральнай пракуратуры Польшчы таксама заявіў, што запыт аб экстрадыцыі, пададзены беларускімі ўладамі, быў незаконным.

Пасля вынясення акруговым судом рашэння па справе сп. Плескачова Леанід Марозаў, дарадца Святланы Ціханоўскай па прававых пытаннях, заявіў, што экстрадыцыя сп. Плескачова стала б «абуральным парушэннем міжнароднага права», і выказаў падзяку Польшчы «за паслядоўную падтрымку ў адстойванні дэмакратычных каштоўнасцяў і абароне правоў беларусаў».[24] Гэтая справа стала публічным прыкладам прызнання польскімі судовымі органамі палітычнага характару крымінальнага пераследу, ініцыяванага Беларуссю ў дачыненні да апазіцыйнага актывіста, і адмовы ад супрацоўніцтва на гэтай падставе.

24 Святлана Ціханоўская, «Польскі суд адхіліў запыт рэжыму Лукашэнкі аб экстрадыцыі беларускага актывіста Зміцера Плескачова» (29 лістапада 2024 г.), даступна па адрасе: https://tsikhanouskaya.org/en/news/polish-court-denied-lukashenka-regimes-request-to-extradite-belarusian-activist-dmitry-pleskachev.html.

Арх. №

Архівавана «_____» ____________________ 20__ г.

Завершана

Прыведзеныя справы з’яўляюцца прыкладамі больш шырокай практыкі транснацыянальных рэпрэсій, у рамках якой рэжым А. Лукашэнкі выкарыстоўвае не толькі механізмы Інтэрпола, але і працэдуры экстрадыцыі на падставе шматбаковых пагадненняў СНД і двухбаковых дамоваў аб прававой дапамозе і выдачы.

Інтэрпол — гэта міжурадавая арганізацыя са штаб-кватэрай у Ліёне (Францыя), якая налічвае 196 членаў, у тым ліку Рэспубліку Беларусь (далей — «Беларусь»).

Паводле звестак Інтэрпола, яго місія заключаецца ў тым, каб «дапамагаць паліцыі ў [розных юрысдыкцыях] працаваць разам, каб зрабіць свет больш бяспечным».[25]

Асноўная мэта Інтэрпола, паводле яго Статута,[26] заключаецца ў тым, каб «забяспечыць і садзейнічаць як мага шырэйшай узаемнай дапамозе паміж усімі органамі крымінальнай паліцыі ў межах законаў, якія дзейнічаюць у розных краінах, і ў духу **Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека**[27] ». Гэтая мэта абмяжоўваецца строгай канстытуцыйнай забаронай для Інтэрпола «прымаць якія-небудзь дзеянні або ажыццяўляць дзейнасць палітычнага, ваеннага, рэлігійнага або расавага характару».[28]

Адным з найважнейшых аспектаў працы Інтэрпола з'яўляецца падрыхтоўка апавяшчэнняў Інтэрпола — міжнародных запытаў аб супрацоўніцтве або абвестак, якія дазваляюць паліцыі краін-членаў абменьвацца паміж сабой важнай інфармацыяй, звязанай са злачыннасцю. Апавяшчэнні публікуюцца Генеральным сакратарыятам Інтэрпола па запыце адпаведнага Нацыянальнага цэнтральнага бюро і падаюцца ўсім краінам-сябрам Інтэрпола.

Так, да прыкладу «Чырвоныя апавяшчэнні» Інтэрпола накіраваны на ўстанаўленне месцазнаходжання і арышт асоб, якія адшукваюцца для крымінальнага пераследу або адбывання пакарання, з мэтай наступнай экстрадыцыі ў запытваючую краіну.

Краіны-сябры Інтэрпола могуць таксама запытваць супрацоўніцтва адно ў аднаго і праз іншы механізм, вядомы як «дыфузія». Дыфузіі накіроўваюцца непасрэдна Нацыянальным цэнтральным бюро ўсім ці некаторым краінам-сябрам Інтэрпола. Як і чырвоныя апавяшчэнні Інтэрпола, дыфузіі павінны адпавядаць Статуту і Правілам Інтэрпола аб апрацоўцы дадзеных (далей — Правілы).[29]

Статут Інтэрпола[30] прадугледжвае існаванне Камісіі па кантролі за файламі (далей — «Камісія»), незалежнага органа, задачай якога з'яўляецца забеспячэнне таго, каб апрацоўка персанальных дадзеных Інтэрполам адпавядала нормам Інтэрпола,[31] у першую чаргу Правілам.

## ТРАНСНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ РЭПРЭСІІ ПРАЗ ІНТЭРПОЛ: ЯК ПРАЦУЕ СІСТЭМА І ЯК ЁЮ МАНІПУЛЮЮЦЬ

Апавяшчэнне ўяўляе сабой запыт аб міжнародным супрацоўніцтве або любое міжнароднае апавяшчэнне, якое публікуецца Інтэрполам па просьбе Нацыянальнага цэнтральнага бюро і накіроўваецца ўсім членам.[32] Усе запыты на размяшчэнне апавяшчэнняў правяраюцца Генеральным сакратарыятам Інтэрпола на прадмет адпаведнасці Правілам.[33]

Дыфузія — гэта запыт аб міжнародным супрацоўніцтве або любое міжнароднае апавяшчэнне

25 https://www.interpol.int/Who-we-are/What-is-INTERPOL.

26 I/CONS/GA/1956 (2023), даступна па адрасе: https://www.interpol.int/Search-Page?search=Constitution+of+INTERPOL (далей — «Статут»).

27 Статут, артыкул 2(1), выдзелена аўтарам.

28 Тамсама, артыкул 3.

29 III/IRPD/GA/2011 (2025), даступна па адрасе: https://www.interpol.int/Search-Page?search=Rules+on+the+Processing+of+-Data (далей — «Правілы»).

30 Статут, артыкул 36.

31 https://www.interpol.int/Who-we-are/Commission-for-the-Control-of-INTERPOL-s-Files-CCF.

32 Правілы, артыкул 1 (13).

33 Правілы, артыкул 77 (1).

ад нацыянальнага цэнтральнага бюро, якое накіроўваецца непасрэдна ў адно ці некалькі нацыянальных цэнтральных бюро і адначасова рэгіструецца ў паліцэйскай базе даных Інтэрпола.[34]

На практыцы, калі дыфузія накіроўваецца ва ўсе іншыя нацыянальныя цэнтральныя бюро, яна мае для адпаведнай асобы тыя ж наступствы, што і апавяшчэнне.

У адрозненне ад паведамленняў, накіраванне дыфузій праз інфармацыйныя сістэмы Інтэрпола не патрабуе ўдзелу Генеральнага сакратарыята і ажыццяўляецца выключна па ініцыятыве адпаведнага Нацыянальнага цэнтральнага бюро. Нацыянальныя цэнтральныя бюро маюць права на прамы доступ да інфармацыйнай сістэмы Інтэрпола пры выкананні сваіх функцый у адпаведнасці са Статутам, уключаючы запіс, абнаўленне і выдаленне даных непасрэдна ў базе даных, а таксама стварэнне сувязей паміж данымі.[35] Нацыянальнае цэнтральнае бюро абавязанае забяспечыць адпаведнасць дадзеных артыкулу 2 Статута, а таксама апрацоўку дадзеных у адпаведнасці з «міжнароднымі канвенцыямі і асноўнымі правамі чалавека, замацаванымі ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека».[36]

## ЯК ЗВЯЗАЦЦА З ІНТЭРПОЛАМ І АБАРАНІЦЬ СВАЕ ПРАВЫ: КІРАЎНІЦТВА ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ І БЕЛАРУСАК

Для асобы адзінай даступнай магчымасцю звароту з'яўляецца Камісія,[37] якая можа падаць яму ці ёй інфармацыю і выдаліць дадзеныя з інфармацыйных сістэм Інтэрпола. Юрыдычная каманда Офіса Святланы Ціханоўскай сістэматычна аказвае дапамогу па звароце ў Камісію ў інтарэсах беларусаў і беларусак, якія сутыкнуліся з выкарыстаннем рэжымам А. Лукашэнкі інструментаў і механізмаў Інтэрпола для палітычна матываванага пераследу.[38] **Асобы, якія маюць патрэбу ў такой дапамозе, могуць звярнуцца ў юрыдычную каманду на адрас: legal@tsikhanouskaya.org.**

## ВЫКАРЫСТАННЕ АБВІНАВАЧАННЯЎ У ЭКСТРЭМІЗМЕ, ТЭРАРЫЗМЕ, МАХЛЯРСТВЕ ЦІ ЭКАНАМІЧНЫХ ЗЛАЧЫНСТВАХ ЯК ПРЫКРЫЦЦЁ ПАЛІТЫЧНАГА ПЕРАСЛЕДУ: ПРАКТЫКА

Праблема злоўжывання інфармацыйнымі сістэмамі Інтэрпола з боку рэпрэсіўных рэжымаў, такіх як рэжым А. Лукашэнкі, праз іх Нацыянальныя цэнтральныя бюро, добра задакументаваная ў навуковых каментарах і прафесійных справаздачах.

Чырвоныя апавяшчэнні называюць «снайперскай вінтоўкай аўтакратаў», якая выкарыстоўваецца для пераследу дысідэнтаў за межамі краіны.[39] Уцечкі аўдыёзапісаў тэлефонных перамоваў супрацоўнікаў праваахоўных органаў Беларусі,[40] роўна як і зафіксаваная практыка юрыдычнай каманды Офіса Святланы Ціханоўскай, паказваюць, як супрацоўнікі Нацыянальнага цэнтральнага бюро ў Менску абмяркоўваюць спосабы схаваць палітычны характар спраў, маскіруючы іх пад звычайныя крымінальныя абвінавачванні, уключаючы злачынствы супраць уласнасці, злачынствы, звязаныя з наркотыкамі, або паклёп.

Напрыклад, юрыдычнай камандай Офіса Святланы Ціханоўскай задакументаваны выпадак грамадзяніна Беларусі Алега (імя зменена).

34 Правілы, артыкул 1 (14).

35 Правілы, артыкул 6 (1)(a).

36 Правілы, артыкул 34 (1).

37 Статут Камісіі, [II.E/RCIA/GA/2024 (2025)], артыкул 29.

38 Офіс Святланы Ціханоўскай, Першы выпадак, калі беларуса выдалілі з базы Інтэрпола дзякуючы працы Офіса Святланы Ціханоўскай, https://tsikhanouskaya.org/be/news/pervyj-sluchaj-kogda-belarusa-udalili-iz-bazy-interpola-blagodarya

39 Бэн Кіт, Жаклін Янэль, «Рэпрэсіі праз Інтэрпол: як Беларусь ператварае паліцэйскае супрацоўніцтва ў інструмент транснацыянальных рэпрэсій і стварае канстытуцыйныя праблемы для Еўропы», апублікавана ў Verfassungsblog у студзені 2026 г., даступна па адрасе: https://verfassungsbth/de.

40 BelPol, СУСВЕТНЫ СКАНДАЛ — Лукашэнка выкарыстоўвае Інтэрпол, https://www.youtube.com/watch?v=SjrtnYJGKD0



# СПРАВА № 1614

па абвінавачванні [redacted]
у здзейсненні злачынства паводле ч.3 арт. 243
Крымінальнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь

Алег, які ўдзельнічаў у мірных пратэстах пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і падтрымліваў беларускую апазіцыю, падвергся пераследу з боку рэжыму А. Лукашэнкі. Пасля затрымання ў Беларусі ён паведаміў, што падвяргаўся насіллю ў месцах утрымання пад вартай, пагрозам смерці і жорсткаму абыходжанню з боку супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Пад ціскам спецслужбаў ён уцёк з Беларусі і атрымаў міжнародную абарону ў Польшчы.

У студзені 2024 года Алег быў затрыманы ў Польшчы на падставе запыту Беларусі, перададзенага праз Інтэрпол. Нацыянальнае цэнтральнае бюро ў Мінску ўнесла яго ў міжнародны вышук на падставе абвінавачанняў па артыкуле 328(3) Крымінальнага кодэкса Беларусі, які датычыцца буйнамаштабнага незаконнага абароту наркотыкаў або незаконнага абароту наркотыкаў, учыненага арганізаванай групай.

Польскі суд адмовіў у экстрадыцыі Алега, палічыўшы, што ў выпадку яго вяртання ў Беларусь існуе рэальная пагроза пераследу па палітычных матывах, катаванняў і парушэнняў асноўных правоў Алега, а таксама адзначыў, што крымінальны пераслед у дачыненні да яго з боку Беларусі звязаны з яго ным удзелам у пратэстных акцыях і падтрымкай беларускіх дэмакратычных сіл.

У жніўні 2025 года Генеральны сакратарыят Інтэрпола афіцыйна пацвердзіў, што Алег больш не з’яўляецца аб’ектам вышуку або распаўсюджвання Інтэрпола праз выдаленне яго файла з базы Інтэрпола.[41]

41 «Зеркало», «Памятаеце ўдзельніка пратэсту, аб выдачы якога па крымінальных абвінавачваннях прасілі ўлады? Вось якой скончылася справа» (14 жніўня 2025 г.), даступна па адрасе: https://news.zerkalo.io/life/106242.html (на рускай мове).

Том № ________

Пачата ________________________ ______ г.

Завершана ________________________ ______ г.

На __________ старонках

Захоўваць да ____________________________

Адна з уцечак аўдыёзапісаў тэлефонных перамоваў паміж супрацоўнікамі праваахоўных органаў таксама сведчыць аб спробах утойвання сапраўдных палітычна матываваных абвінавачанняў. Ніжэй прыводзіцца дыялог паміж **Дзмітрыем Мядзведзевым**, супрацоўнікам Нацыянальнага Цэнтральнага бюро Інтэрпола, цяпер — начальнікам Першага аддзялення Нацыянальнага Цэнтральнага бюро Інтэрпола, і **Сяргеем Бормасавым**, начальнікам аддзялення вышуковай работы Маскоўскага РУУС Мінска.

**Кантэкст**

У гэтай размове Дзмітрый Мядзведзеў і Сяргей Бормасаў абмяркоўваюць вышук асоб, якія знаходзяцца за мяжой, па справах з відавочным палітычным кантэкстам. Мядзведзеў прама ўказвае, што Генеральны сакратарыят Інтэрпола не прымае такія справы з-за артыкула 3 Статута Інтэрпола, які забараняе ўмяшанне ў справы палітычнага характару. У працягу размовы ён фактычна раіць, як фармуляваць фабулу справы аб пратэстных графіці, каб схаваць палітычны матыў і павысіць шанцы праходжання запыту праз каналы Інтэрпола.

**Бормасаў:** Так, Бормасаў слухае.

**Мядзведзеў:** Мікалаевіч, Мядзведзеў непакоіць.

**Бормасаў:** Так-так-так.

**Мядзведзеў:** Ну падкажы, што там з Войцекам?

**Бормасаў:** Ну, яго, Дзіма, затрымалі ўчора мы.

**Мядзведзеў:** Затрымалі, так?

**Бормасаў:** Так.

**Мядзведзеў:** Вы тады паведамленне ў наш адрас аб тым, што просім пошукавыя мерапрыемствы спыніць, у сувязі з яго ўстанаўленнем на тэрыторыі РБ.

**Бормасаў:** Дык а я ўжо табе напісаў ліст, сёння сыдзе табе.

**Мядзведзеў:** А, ужо сёння сыйдзе? Ну добра, усё добра.

**Бормасаў:** Так-так

**Мядзведзеў:** Як увогуле справы?

**Бормасаў:** Ну як… палітычнымі засыпаемся.

**Мядзведзеў:** Ну гэта зразумела, зразумела…

**Бормасаў:** Мы-то яшчэ добра, мы-то яшчэ толькі траіх, як бы. У суседзі Фрунзенскія там, Ленінскія, Цэнтравікі, я ведаю, што ў іх увогуле ўсё дрэнна. У іх там па 10, па 20 і ўсё як адзін за мяжой.

**Мядзведзеў:** І мы тут, нажаль, дапамагчы не можам…

**Бормасаў:** Ну…

**Мядзведзеў:** Не ведаю, даходзіла да вас інфармацыя? Каго-небудзь вярталі вам ужо, не?

**Бормасаў:** Не. А што вярталі?

**Мядзведзеў:** Ну, мы вяртаем, генсак не бярэ гэтых таварышаў. Гэта значыць, артыкул 3 у нас ёсць. Інтэрпол катэгарычна абвяргае, адмаўляе і не ўдзельнічае ў справах палітычных, расавага, вайсковага характару. Палітычны характар — відавочны.

**Бормасаў:** Не, гэта зразумела. Гэта па іх гэтаму статуту.

**Мядзведзеў:** Так-так. Па статуце, па статуце, артыкул 3 і ўсё, мы вяртаем.

**Бормасаў:** Дык а яны пад гэты артыкул увогуле ўсіх-усіх-усіх вось гэтых таварышаў ці нейкі?..

**Мядзведзеў:** Не, кожны склад мы ўдакладняем, нейкія мы адразу адпраўляем, нейкія гатовыя. Артыкул 130 распальванне расавай варожасці там, вось гэта вось, непрыязнасць, так, вось гэты відавочны палітычны падтэкст, расавае ўсё, гэта ў нас ужо ідзе, так. Паклёп — мы з імі раіліся, яны сказалі: «Не, усё роўна». Там паклёп менавіта ў дачыненні да там службовай асобы таксама 188 — такая ж бздура.

---

Абмеркаванне графіці і абыходу правілаў Інтэрпола

---

**Бормасаў:** Ну вось глядзі, у нас, дапусцім…

**Мядзведзеў:** … 364-я таксама яны, яны ўжо нам загарнулі ўсе.

**Бормасаў:** Загарнулі 364-е ўсе, так?

**Мядзведзеў:** так, так, так

**Бормасаў:** У нас будзе 339-я адна зараз новая. Цяпер будзе 339-я. Новая справа.

**Мядзведзеў:** Калі чыстая — без пытанняў. Калі чыстая 339-я.

**Бормасаў:** Размалёўвалі сцены і электрашчытавыя ў бел-чырвона-белыя сцягі.

**Мядзведзеў:** Ну, у дадзеным выпадку, тады глядзі, калі там будзе пазначана, што ў сцягі, то тады яны не пройдуць. Калі будзе проста, што псавалі маёмасць, там размалёўвалі фарбай, нешта такое, тады можа прайсці.





# СПРАВА № 1501

па абвінавачванні Андрэя Віктаравіча Гнёта ў здзейсненні злачынства паводле ч. 3 арт. 243 Крымінальнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь

Іншым прыкладам з практыкі юрыдычнай каманды Офіса Святланы Ціханоўскай з’яўляецца прыклад затрымання ў Сербіі Андрэя Гнёта — беларускага журналіста і кінарэжысёра, апазіцыйнага актывіста, які стаў аб’ектам запыту аб экстрадыцыі ў Беларусь па абвінавачанні ва ўхіленні ад выплаты падаткаў. Андрэй Гнёт адпрэчыў абвінавачанні і заявіў, што крымінальная справа супраць яго была палітычна матываванай і звязаная з ягонай антылукашэнкаўскай дзейнасцю, публічнай крытыкай рэжыму і ўдзелам у пратэстным руху пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года ў Беларусі.

У кастрычніку 2023 года Андрэй Гнёт быў затрыманы на падставе запыту, накіраванага Беларуссю па каналах Інтэрпола. Ён правёў больш за сем месяцаў пад вартай у чаканні працэдуры экстрадыцыі, пасля чаго ў чэрвені 2024 года быў пераведзены пад хатні арышт. На працягу ўсяго разбору ён неаднаразова заяўляў, што экстрадыцыя ў Беларусь падвергне яго рызыцы катаванняў, палітычна матываваных праследаў і пазбаўлення права на справядлівы судовы разбор.

Справа Андрэя Гнёта прыцягнула шырокую міжнародную ўвагу. Праваабарончыя арганізацыі, беларускія дэмакратычныя сілы, мастакі, кінематаграфісты і журналісты публічна выступілі супраць ягонай экстрадыцыі з Сербіі ў Беларусь. Еўрапейскі парламент прыняў рэзалюцыю, якая заклікае Сербію не экстрадаваць сп. Гнёта, і выказаў заклапочанасць з нагоды 300 000 беларусаў і беларусак, якія былі вымушаныя пакінуць Беларусь з 2020 года і сутыкнуліся з палітычнымі рэпрэсіямі за мяжой.[42]

У верасні 2024 года апеляцыйны суд Сербіі адмяніў раней прынятае рашэнне аб выдачы Андрэя Гнёта і распарадзіўся аб паўторным разглядзе справы. Пасля прыкладна аднаго года ўтрымання пад вартай і хатняга арышту, у кастрычніку 2024 года сербскія ўлады вызвалілі яго[43] і дазволілі пакінуць Сербію і выехаць у адну з краін Еўрапейскага саюза. Распаўсюджаны праз Інтэрпол запыт Беларусі аб яго выдачы быў пасля выдалены з базы дадзеных.

2023

42 Рэзалюцыя Еўрапейскага парламента ад 19 верасня 2024 года аб цяжкім становішчы палітычных зняволеных у Беларусі (2024/2804(RSP)), даступная па адрасе: https://www.europarl.europa.eu/doceo/document/TA-10-2024-0009_EN.pdf, п.

43 Беларуская служба Радыё «Свабодная Еўропа» / «Радыё Свабода», «Беларускі актывіст Андрэй Гнёт вызвалены Сербіяй» (31 кастрычніка 2024 г.), даступна на адрас: https://www.rferl.org/a/belarus-hnyot-released-serbia-lukashenka/33html.



# СПРАВА № 13.16 2024

па абвінавачванні Алега Івановіча Каўрыгіна ў здзейсненні злачынстваў паводле ч. 1 арт. 130, ч. 3 арт. 243, ч. 4 арт. 16 і ч. 2 арт. 243-3, ч. 2 арт. 295, ч. 3 арт. 361, ч. 1 арт. 361-4, ч. 2 арт. 361-4, арт. 369-1, ч. 4 арт. 16 і ч. 1 арт. 427 Крымінальнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь

Яшчэ адзін кейс наглядна дэманструе, якім чынам рэжым Лукашэнкі спрабуе выкарыстоўваць механізмы Інтэрпола для пераследу сваіх палітычных апанентаў, маскіруючы палітычна матываваны пераслед пад агульнакрымінальную справу. Гаворка ідзе пра справу беларускага прадпрымальніка і заснавальніка сеткі медыцынскіх цэнтраў «Новы зрок» Алега Каўрыгіна, які быў абвешчаны ў міжнародны вышук па лініі Інтэрпола па абвінавачанні ва ўхіленні ад выплаты падаткаў. Наступны разгляд справы ў Інтэрполе паказаў, што пераслед насіў пераважна палітычны характар.

У лютым 2024 года Беларусь ініцыявала міжнародны вышук Алега Каўрыгіна праз Інтэрпол па абвінавачанні ва ўхіленні ад выплаты падаткаў у асабліва буйным памеры. Ужо ў сакавіку 2024 г. ён быў затрыманы на ўкраінска-польскай мяжы на падставе адпаведнага запыту.

Нягледзячы на фармальна эканамічны характар абвінавачванняў, пасля ў дачыненні да Каўрыгіна былі вылучаныя таксама абвінавачванні ў «дыскрэдытацыі Рэспублікі Беларусь», садзейнічанні «экстрэмісцкай дзейнасці», закліках да санкцый і распальвання варожасці. Гэта стала дадатковым пацвярджэннем палітычнай матывацыі пераследу.

У сакавіку 2026 года Інтэрпол прыняў рашэнне выдаліць дадзеныя Алега Каўрыгіна са сваіх інфармацыйных сістэм. Па словах заяўніка, Камісія прыйшла да высновы аб палітычным характары справы і наяўнасці маніпуляцый доказамі.

Том № ________

Пачата ____________________ ______ г.

Завершана ____________________ ______ г.

На __________ старонках

Захоўваць да ______________________

Таксама паказальнай з'яўляецца спроба ўздзеяння на Генеральны сакратарыят Інтэрпола з боку прадстаўнікоў Міністэрства замежных спраў Беларусі, інфармацыя аб якой таксама патрапіла ў запіс тэлефонных размоваў паміж начальнікам Нацыянальнага Цэнтральнага бюро Інтэрпола **Аляксандрам Пятранам** і начальнікам міжнародна-прававога ўпраўлення Генеральнай пракуратуры **Алегам Хлышчанкам**.

**Кантэкст**

Дадзеная размова тычыцца спробы рэжыму А. Лукашэнкі аказаць ціск на Інтэрпол праз Міністэрства замежных справаў пасля адмовы ў справе Святланы Ціханоўскай, пазначанай суразмоўцамі як «Прынцэса». Петран паведамляе, што па даручэнні міністра замежных спраў Уладзіміра Макея беларускі амбасадар спрабаваў умяшацца ў сітуацыю і дамагчыся перагляду пазіцыі Інтэрпола, аднак быў фактычна адхілены. Размова пацвярджае, што Інтэрпол кваліфікаваў запыты ў дачыненні да Ціханоўскай як палітычна матываваныя і адмовіўся разглядаць іх у рамках сваёй кампетэнцыі ў адпаведнасці з артыкулам 3 Статута Інтэрпола.

**Хлышчанка:** Алё.

**Петран:** Олег Викторович, приветствую.

**Хлышчанка:** Добры дзень.

**Петран:** Ёсць хвілiначка?

**Хлышчанка:** Ну.

**Петран:** А ўжо ў курсе вы па МЗС, як там нават МЗС спрабаваў па адным фігуранту заходзіць ? У курсе ж, мусіць, па-мойму, так?

**Хлышчанка:** Не, не ў курсе?

**Петран:** Не ў курсе? Таа… Калі… Калі была адмова, так бы мовіць, па персанажу, які называецца «Прынцэса».

**Хлышчанка:** А, ну зразумела.

**Петран:** Зразумелі, так?

**Хлышчанка:** Ну, у мяне ж дакументы на «Прынцэсу».

**Петран:** Так, Макей даў каманду амбасадару ламануцца туды. І ён ламануўся. Пасля чаго…

**Хлышчанка:** Яго хацяб у паліцыю не здалі? Бо пашпарт мае, недатыкальны, так?

**Петран:** Не, яго проста выгналі (смяецца).

**Хлышчанка:** Выгналі адтуль?

**Петран:** Гэта без жартаў. То бок, гэта такая справа, я гавару…

**Хлышчанка:** Ну, нібыта людзі сур'ёзныя. Ведаюць, з правам працуюць міжнародным доўга…

**Петран:** А ім дзявацца няма куды. Гэта ж міжнароднае права, тут такая фішка, вось

яны вось такую фармулёўку абралі вельмі прыгожую, палітычна… так называецца, палітычны падтэкст — раз. І другое… у іх заклён які…

**Хлышчанка:** Не, ну вы хацелі, каб там адны дурні працавалі?

**Петран:** Так-так-так. А другое яны кажуць: «злачынства бачым, але не наша кампетэнцыя».

**Хлышчанка:** Ну, правільна кажуць.




## ІНТЭРПОЛ НЕ АДКАЗВАЕ ЗАЎТРА: РЭАЛЬНЫЯ ТЭРМІНЫ РАЗГЛЯДУ ЗВАРОТАЎ

Асобнай праблемай датычна працы Камісіі з'яўляюцца тэрміны разгляду запытаў. Палата па разглядзе запытаў Камісіі абавязана прымаць рашэнні ў пэўныя тэрміны. У дачыненні да запытаў доступу да дадзеных Камісія павінна прыняць рашэнне на працягу чатырох месяцаў з даты прызнання запыту прымальным.[44] У адносінах да запытаў аб выпраўленні або выдаленні дадзеных Камісія павінна прыняць рашэнне на працягу дзевяці месяцаў з даты прызнання адпаведнага запыту прымальным Камісіяй.[45]

У выключных выпадках гэтыя тэрміны могуць быць прадоўжаны.[46] Акрамя таго, Правілы не ўстанаўліваюць тэрмінаў для прыняцця Камісіяй рашэння аб прымальнасці справы.

На практыцы праца Камісіі характарызуецца паўсюднымі і працяглымі затрымкамі. Еўрапейская

44 Статут Камісіі, [II.E/RCIA/GA/2024 (2025)], артыкул 40 (1).

45 Тамсама, артыкул 40 (2).

46 Тамсама, артыкул 40 (3).

асацыяцыя адвакатаў па крымінальных справах (European Criminal Bar Association, «ECBA») адзначае, што ўстаноўленыя законам «тэрміны вельмі часта не выконваюцца» і што «пра затрымкі і нейкія змястоўныя тлумачэнні наконт іх заяўніку рэдка паведамляюць як падчас расследавання [Камісіі], так і ў канчатковым рашэнні [Камісіі]».[47]

Прыкладам наяўнасці такіх затрымак з боку Камісіі можа выступаць непублічны кейс, над якім на сённяшні дзень працуе юрыдычная каманда Офіса Святланы Ціханоўскай.

Беларускі бізнэсовец Х., які адкрыта падтрымліваў беларускія дэмакратычныя сілы і ўдзельнічаў у мерапрыемствах, звязаных з прэзідэнцкай выбарчай кампаніяй Святланы Ціханоўскай 2020 года, стаў аб’ектам палітычна матываваных пераследаў з боку рэжыму Лукашэнкі. Ягоная рэкламная кампанія размясціла інфармацыю пра апазіцыйны мітынг, пасля чаго адпаведны медыя-экран быў адключаны па рашэнні мясцовых органаў. Пасля агульнанацыянальнай забастоўкі, абвешчанай Святланай Ціханоўскай у кастрычніку 2020 года прарэжымныя каналы у Telegram пачалі публікаваць пагрозы і асабістую інфармацыю аб Х.

На працягу кастрычніка-снежня 2020 года кампанія Х. падвяргалася шматлікім праверкам з боку розных беларускіх кантралюючых органаў, у тым ліку — Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі, санітарных органаў, службаў экстранай дапамогі і органаў рэгулявання гандлю. Пазней на кампанію былі накладзены штрафы, канфіскавана прадпрымальніцкая дакументацыя. Самому Х. пачалі пагражаць арыштам. Асцерагаючыся турэмнага зняволення і пераследу, бізнесмен пакінуў Беларусь і з’ехаў ва Украіну ў снежні 2020 года.

Пасля ў Беларусі была ўзбуджаная крымінальная справа ў дачыненні да Х. па абвінавачваннях, звязаных з ухіленнем ад выплаты падаткаў і меркаваным «падзелам бізнесу» з мэтай ухілення ад падаткаабкладання. Яго маёмасць у Беларусі была арыштаваная ў студзені 2021 года.

У красавіку 2025 года стала вядома, што Беларусь накіравала чырвонае апавяшчэнне Інтэрпола ў дачыненні да Х. па абвінавачваннях, звязаных з махлярствам. Юрыдычная каманда Офіса Святланы Ціханоўскай накіравала запыт на выдаленне файла Х. у жніўні 2025 года. Запыт быў прызнаны прымальным толькі ў верасні таго ж года. Да гэтага часу Інтэрпол не падаў фінальнага рашэння адносна запыту аб выдаленні даных у дачыненні да Х.

## БЕЗ ПРАВА ВЕДАЦЬ: ЧАМУ ІНТЭРПОЛ НЕ РАСКРЫВАЕ ДАДЗЕНЫЯ АБ ПЕРАСЛЕДУЕМЫХ БЕЛАРУСАХ І БЕЛАРУСКАХ

Іншай праблемай, з якой сутыкаюцца беларусы і беларускі пры звароце з адпаведнымі запытамі ў Камісію, з’яўляецца адсутнасць інфармацыі на пачатковым этапе разбору, што не дазваляе заяўніку ці заяўніцы актыўна абараняць свае правы і законныя інтарэсы.

У выніку шматлікія заявы аб доступе да дадзеных або аб іх выдаленні або выпраўленні падаюцца без ведання аб наяўнасці або адсутнасці файлаў. На практыцы такія запыты становяцца «прэвентыўнымі». У выніку разгляду падобнага запыту можа высветліцца, што на момант яго атрымання ў інфармацыйных сістэмах Інтэрпола даных адносна канкрэтнай асобы няма.[48]

Таму склалася практыка, пры якой асобы падаюць свае заявы ў Камісію ў прэвентыўным парадку і тлумачаць, чаму даныя, якія датычацца іх, не павінны апрацоўвацца Інтэрполам, хоць даных у дачыненні да гэтай асобы ў Інтэрпола няма. Гэтая практыка абумоўленая адсутнасцю інфармацыі пра тое, ці сапраўды адпаведнае Нацыянальнае цэнтральнае бюро ініцыявала працэдуру, накіраваўшы запыт аб выпуску чырвонага паведамлення або дыфузіі.

Падыход Камісіі да разгляду такіх прэвентыўных заяў, паводле слоў ECBA, «заснаваны на

47 Еўрапейская асацыяцыя крымінальных адвакатаў, «Абарона сістэм Інтэрпола: рэкамендацыі па рэформе» [13.02.2026] (далей «Справаздача ECBA»), даступны на адрас https://site.ecba.org/working-groups/international-co-operation/ecba-latr-submit-joint-response-to-interpols-ccf-statute-amendments/, стар. 4, пп. 1.3-1.4.

48 Справаздача ECBA, стар. 10, пункт 3.1.

 нявызначанай прававой базе, паколькі яны не прадугледжаны правіламі».[49]

Юрыдычная каманда Офіса Святланы Ціханоўскай рэгулярна сутыкаецца з такімі «прэвентыўнымі» запытамі, калі актывісткі і актывісты з Беларусі просяць накіраваць адпаведны запыт у Камісію, дакладна не ведаючы, ці апрацоўваюцца ў дачыненні да іх дадзеныя Інтэрполам. Часта, такія запыты матываваныя тым, што асоба знаходзіцца альбо ў агульнарэспубліканскім, альбо міждзяржаўным вышуку ў адпаведнасці з Канвенцыяй СНД аб прававой дапамозе і прававых адносінах па грамадзянскіх, сямейных і крымінальных справах. Атрымаць інфармацыю аб такім вышуку не ўяўляе складанасці з-за пастаянных уцечак базы вышуку Расійскай Федэрацыі.[50]

Паколькі Нацыянальнае цэнтральнае бюро Беларусі захоўвае кантроль над унесенымі ім данымі, яно мае права абмяжоўваць доступ да гэтай інфармацыі для іншых удзельнікаў сістэмы Інтэрпола. На практыцы гэта можа прыводзіць да сітуацыі, калі чалавек не мае магчымасці даведацца, што ў адносінах да яго ў базах Інтэрпола змяшчаюцца звесткі аб вышуку ці іншыя дадзеныя. Такая непразрыстасць стварае дадатковыя рызыкі злоўжыванняў, паколькі пазбаўляе чалавека магчымасці своечасова аспрэчыць інфармацыю або дабіцца яе выдалення. У выніку абарона правоў становіцца пераважна рэактыўнай: чалавек даведваецца аб існаванні дадзеных толькі пасля наступлення негатыўных наступстваў, напрыклад пры перасячэнні мяжы, затрыманні ці іншай праверцы з боку праваахоўных органаў.[51]


CCF - INTERPOL

Commission de Contrôle des Fichiers de l'O.I.P.C. - INTERPOL
Commission for the Control of INTERPOL's Files
Comisión de Control de los Ficheros de la OIPC-INTERPOL
لجنة الرقابة على محفوظات المنظمة الدولية للشرطة الجنائية (الإنتربول)
*INTERPOL's Independent Authority for the Control and Protection of Personal Data*

[redacted]

By e-mail only

Our ref: [redacted]

Subject: Request concerning [redacted]

Dear Sir,

[redacted]

As provided for in Article 35 of the Statute of the Commission, information connected with a request is accessible to the applicant subject to restrictions required by the source of the data challenged.

As a result, please note that in your client's case/at this stage, the National Central Bureau (NCB) of INTERPOL in Belarus has restricted the communication of any information including the existence or the absence of data concerning your client in the INTERPOL Information System.

[redacted]

We will keep you informed of further developments in due course.

Yours faithfully,

Secretariat to the Commission
for the Control of INTERPOL's Files

[redacted]

C.C.F. - 200 quai Charles de Gaulle - 69006 Lyon - France - e-mail : CCF@interpol.int

49 Тамсама, стар. 10, пункт 3.2.

50 Медыязона. Каго шукае МУС. Поўная база вышуку на «Медыязоне». https://zona.media/wanted?p=1&t=all&s=statusAll&q=

51 Бэн Кіт, Жаклін Янэль, «Рэпрэсіі праз Інтэрпол: як Беларусь ператварае паліцэйскае супрацоўніцтва ў інструмент транснацыянальных рэпрэсій і стварае канстытуцыйныя праблемы для Еўропы», апублікавана ў Verfassungsblog у студзені 2026 г., даступна па адрасе: https://verfassungsbth /de.

Правілы прадугледжваюць канкрэтныя правы Генеральнага сакратарыята, якія могуць быць рэалізаваны ў дачыненні да Нацыянальнага цэнтральнага бюро, якое прадстаўляе ў сістэму недакладныя або неадпаведныя дадзеныя («карэктуючыя меры»), такія як прыпыненне або водгук правоў доступу, выпраўленне памылак пры апрацоўцы, нагляд за аперацыямі па апрацоўцы дадзеных, якія ажыццяўляюцца Нацыянальным цэнтральным бюро, і накіраванне групы па ацэнцы ў Нацыянальнае цэнтральнае бюро.[52]

Акадэмічныя каментатары адзначаюць наступнае ў дачыненні да карэкцыйных мер, прадугледжаных у Правілах: «Канцэпцыя карэкцыйных мер не заўсёды абгрунтавана, паколькі яна мяркуе, што злоўжыванні выкліканыя няведаннем, а не намерам. Безумоўна, некаторыя злоўжыванні могуць быць выкліканы недастатковай падрыхтоўкай або абмежаванымі магчымасцямі на нацыянальным узроўні, і ў гэтым выпадку нагляд можа быць дарэчны. Але калі злоўжыванні носяць паўтаральны, пастаянны характар і накіраваныя супраць апанентаў рэжыму… ідэя аб тым, што адзін толькі нагляд забяспечыць выкананне правіл, непраўдападобная. Нават пры ўвядзенні карэкцыйных мер Інтэрпол дзейнічае, зыходзячы са здагадкі аб добрасумленнасці дзяржаў-членаў. Ён дапускае наяўнасць частых памылак, але не прызнае сістэмных парушэнняў, паколькі гэта азначала б прызнанне злоўжыванняў, якія маюць палітычную матывацыю».[53] Такая пазіцыя мусіць змяніцца.

Рэжым А. Лукашэнкі асведамлены пра гэтыя нормы і не хацеў бы іх прымянення. Пра гэта сведчаць апублікаваныя супольнасцю BelPol аўдыязапісы тэлефонных перамоў паміж начальнікам Нацыянальнага цэнтральнага бюро Інтэрпола ў Рэспубліцы Беларусь **Аляксандрам Пятранам** і начальнікам міжнародна-прававога ўпраўлення Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь **Алегам Хлышчанкам.**

**Кантэкст**

У гэтай размове Аляксандр Петран інфармуе прадстаўніка Генеральнай пракуратуры Алега Хлышчанку аб папярэджанні з боку Інтэрпола. З размовы вынікае, што Генеральны сакратарыят Інтэрпола ўжо наўпрост указваў беларускаму боку на парушэнне артыкула 3, у тым ліку па справах Святланы Ціханоўскай і Вольгі Кавальковай. Петран прызнае рызыку прыпынення доступу беларускага НЦБ да каналаў Інтэрпола ў выпадку працягу падобных дзеянняў.

**Хлышчанка:** Алё.

**Петран:** Алег Віктаравіч, вітаю. Усё знайшоў ... Значыць ... А можаце вы Вайбер уключыць? Я вам спачатку скіну ў Вайбер і прачытаю, што там напісана.

**Хлышчанка:** Ды не трэба. Можа, так дашліце.

**Петран:** Давайце я вам так тады прачытаю.

**Хлышчанка:** А то ў мяне праграмы няма з Вайбера перакідваць куды-небудзь.

52 Правілы, артыкулы 130-131.

53 Чарлі Магры, Тэд Р. Бромунд, Сандра А. Гросман, «Карэкцыйныя меры і праблема празрыстасці ў Інтэрполе» (30 сакавіка 2026 г.), даступна па адрасе: https://journals.law.harvard.edu/ilj/2026/03/corrective-measures-and-and

**Петран:** Добра, давайце я вам прачытаю тады. Добра?

**Хлышчанка:** Ну.

**Петран:** Значыць, глядзіце з 3 ліста вам пакуль… Ну, я папрашу, каб перавялі. Ці на англійскай скінуць? Там усё маркерам выдзелена. Значыць, фразай Правілы апрацоўкі інфармацыі Інтэрполам, якім мы абавязаны прытрымлівацца. Значыць, Нацыянальнае цэнтральнае бюро нясе адказнасць за вызначэнне і ўстанаўленне працэдур, якія гарантуюць, што іх нацыянальныя праваахоўныя органы адпавядаюць прынцыпам і абавязацельствам, выкладзеным у гэтых Правілах, перад тым, як яны могуць прадастаўляць даныя для апрацоўкі ў сістэму. **Ну, то бок, гэта наш выпадак.** Нацыянальнае цэнтральнае бюро нясе адказнасць за рэгулярную ацэнку дзейнасці сваіх нацыянальных органаў у святле дадзеных Правілаў на вызначэнне межаў іх прымянення і робіць усе неабходныя меры, каб, менавіта, спыніць любую дзейнасць у выпадку прадстаўлення неадпаведных даных. Гэтыя, э-э-э… гэта можа ўключаць таксама рызыку, якая адносіцца да неадпаведнасці дадзеных вось гэтых вось Статута. Далей. **А вось далей напісана пра нас, што яны могуць з намі зрабіць за такія рэчы».** А яны папярэджанне нам ужо даслалі. Генеральны сакратарыят Інтэрпола нясе адказнасць за рэгулярную ацэнку дзейнасці нацыянальных цэнтральных бюро на адпаведнасць гэтым Правілам. Генеральны сакратарыят Інтэрпола абавязаны прыняць усе карэкцыйныя меры, каб перапыніць любую не адпаведную дзейнасць, звязаную з апрацоўкамі даных. Значыць, любыя меры могуць уключаць сабой доўгатэрміновае прыпыненне, ну, правоў доступу, прадастаўлення для нацыянальных цэнтральных бюро. І гэтая прапанова Генеральнага сакратарыята выносіцца на зацвярджэнне Выканаўчаму камітэту. Усё, вось — у прамым выглядзе. **А да гэтага нам яны даслалі вось такі дакумент, што канкрэтна, што, вось тады па гэтай Ціханоўскай даслалі, каб мы спынілі любую дзейнасць».** Так прама нам і паказалі, што мы парушаем — яны пішуць — артыкул 3, значыць, у сувязі з выбарамі ў жніўні 2020 года. Што мы не маем права распаўсюджваць гэтую інфармацыю па каналах Інтэрпола. Даслалі раз. І нам вось адмовілі па Кавальковай — канкрэтна напісалі, што гэта, так бы мовіць, парушэнне артыкула 3. **Ну ўсё — кола замкнулася**.

**Хлышчанка:** Мг, зразумела.

**Петран:** Ну, то бок таму вось проста… наступным крокам яны нам… **вось калі мы працягваем — яны проста выносяць на выканкам, і нас адключаюць, так бы мовіць ад дадзеных рэчаў**. Гэта значыць… як бы… **Ну, калі ёсць неабходнасць для радзімы, каб адключылі — я гатовы адправіць. Гэта значыць пытанне здымаецца** …

**Хлышчанка:** Ды ну, пра што вы кажаце, не…

Паказальна, што ў лістападзе 2024 года на пасяджэнні аб’яднанай калегіі Генпракуратуры Беларусі і Генпракуратуры Расіі генеральны пракурор рэжыму Аляксандра Лукашэнкі Андрэй Швед публічна прызнаў, што Інтэрпол «фактычна блакуе» аб’яву ў міжнародны вышук значнай часткі асоб, якія пераследуюцца рэжымам. Паводле яго слоў, больш за палову тых, хто адшукваецца, складаюць асобы, якія абвінавачваюцца ва ўчыненні так званых «злачынстваў экстрэмісцкай накіраванасці» і ўхіленні ад мерапрыемстваў па прызыве на воінскую службу, большасць з якіх пакінулі Беларусь яшчэ да ўзбуджэння крымінальных спраў. Швед таксама паведаміў, што рэжым А.Лукашэнкі распрацоўвае механізм абскарджання рашэнняў Інтэрпола аб адмове ў публікацыі апавяшчэнняў або выдаленні звестак аб асобах, якія адшукваюцца з інфармацыйнай сістэмы арганізацыі.




## НЕАБХОДНАСЦЬ ПАЎТОРНАГА АБМЕЖАВАННЯ ДОСТУПУ РЭЖЫМУ А. ЛУКАШЭНКІ ДА МЕХАНІЗМАЎ ІНТЭРПОЛА

У 2023 годзе злоўжыванні з боку рэжыму А.Лукашэнкі ўжо сталі прадметам разгляду ў межах Інтэрпола: Беларусь знаходзілася пад так званымі «карэкцыйнымі мерамі» арганізацыі, што наўпрост паказвала на наяўнасць сур’ёзных праблем з выкарыстаннем беларускім НЦБ каналаў Інтэрпола.[54] Больш за тое, на Генеральнай асамблеі Інтэрпола ў Вене ў 2023 годзе Беларусь прасоўвала ініцыятыву, якая фактычна абавязвала б Інтэрпол публікаваць запытаныя Red Notices пасля заканчэння вызначанага тэрміну, нават калі такія запыты яшчэ не былі правераныя на адпаведнасць правілам арганізацыі. Такі падыход дэманструе не намер устараніць злоўжыванні, а імкненне аслабіць механізмы папярэдняга кантролю і зрабіць палітычна матываваныя запыты больш аўтаматычнымі. У гэтых умовах Інтэрполу варта не толькі захаваць, але і зноў узмацніць абмежаванні ў дачыненні да рэжыму Лукашэнкі, у тым ліку больш жорсткую папярэднюю праверку ўсіх запытаў, якія паступаюць праз беларускае НЦБ, а таксама магчымасць паўторнага прымянення спецыяльных абмежавальных або карэкцыйных мер да таго часу, пакуль рэжым працягвае выкарыстоўваць крымінальны пераслед як інструмент транснацыянальных рэпрэсій.

54 Бэн Кіт, Рыс Дэвіс, Сандра Гросман, Тэд Р. Бромунд, «Ацэнка вынікаў Генеральнай асамблеі Інтэрпола 2023 года» (5 снежня 2023 г.), даступна па адрасе: https://rednoticemonitor.com/assessing-the-2023-annual-meeting-of-interpol-s-general-assembly

# ХТО ПЕРАСЛЕДУЕ БЕЛАРУСАЎ І БЕЛАРУСАК ЦЯПЕР? НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ЦЭНТРАЛЬНАЕ БЮРО ІНТЭРПОЛ БЕЛАРУСІ



**Бармасаў Сяргей Мікалаевіч**

Начальнік аддзялення вышуковай працы Маскоўскага РУУС Мінска



**Хлышчанка Алег Вітальевіч**

Начальнік міжнародна-прававога ўпраўлення Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь



**Вершэль Аляксей Ігаравіч**

Начальнік 2-га аддзела (процідзеянне транснацыянальнай злачыннасці) НЦБ Інтэрпола, падпалкоўнік міліцыі



**Петран Аляксандр Сяргеевіч**

Былы начальнік упраўлення НЦБ Інтэрпола, палкоўнік міліцыі



**Міхасенка Кірыл Фёдаравіч**

Старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах 2-га аддзела (процідзеянне транснацыянальнай злачыннасці) НЦБ Інтэрпола, падпалкоўнік міліцыі



**Мядзведзеў Дзмітрый Сцяпанавіч**

Супрацоўнік НЦБ Інтэрпола, начальнік 1-га аддзела (міжнародны вышук і экстрадыцыя), падпалкоўнік міліцыі, былы начальнік упраўлення НЦБ Інтэрпола, падпалкоўнік міліцыі



**Быкаў Дзмітрый Сяргеевіч**

Супрацоўнік Цэнтральнага апарата МУС, старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах 2-га аддзела (процідзеянне транснацыянальнай злачыннасці) НЦБ Інтэрпола, падпалкоўнік міліцыі



**Петрык Дзяніс Уладзіміравіч**

Оперупаўнаважаны па асабліва важных справах 2-га аддзела (процідзеянне транснацыянальнай злачыннасці) НЦБ Інтэрпола, старшы лейтэнант міліцыі



**Лавышык Аляксандр Алегавіч**

Старшы інспектар 3-га аддзела (апрацоўка аператыўнай інфармацыі) НЦБ Інтэрпола, старшы лейтэнант міліцыі



**Сунцаў Максім Яўгенавіч**

Супрацоўнік 3-га аддзела (апрацоўка аператыўнай інфармацыі), старшы інспектар НЦБ Інтэрпола, лейтэнант міліцыі



**Жалава Аляксандра Аляксандраўна**

Оперупаўнаважаны па асабліва важных справах 2-га аддзела (процідзеянне транснацыянальнай злачыннасці) НЦБ Інтэрпола, капітан міліцыі

# ВЫСНОВЫ

Праведзены аналіз сведчыць аб тым, што выкарыстанне беларускім рэжымам механізмаў Інтэрпола і іншых інструментаў міжнароднага праваахоўнага супрацоўніцтва не абмяжоўваецца асобнымі спрэчнымі выпадкамі ці памылкамі правапрымянення. Наадварот, сабраныя матэрыялы паказваюць на наяўнасць устойлівай практыкі, у межах якой крымінальны пераслед рэальных ці меркаваных апанентаў рэжыму набывае транснацыянальны характар і працягваецца далёка за межамі Беларусі.

Значная частка асоб, у дачыненні да якіх робяцца падобныя дзеянні, пакінула Беларусь менавіта з прычыны абгрунтаваных асцярог палітычна матываванага пераследу. Нягледзячы на гэта, яны працягваюць сутыкацца з рызыкамі затрымання, абмежавання волі перамяшчэння, экстрадыцыйных працэдур і іншых форм ціску ў трэціх краінах. Разгледжаныя ў гэтым дакладзе выпадкі дэманструюць, што нават у тых сітуацыях, калі механізмы Інтэрпола не выкарыстоўваюцца або недаступныя, рэжым А. Лукашэнкі працягвае дамагацца падобных вынікаў праз двухбаковыя запыты, міжнародную прававую дапамогу і іншыя каналы супрацоўніцтва.

Прынцыповае значэнне маюць апублікаваныя матэрыялы, якія змяшчаюць меркаваныя ўнутраныя камунікацыі супрацоўнікаў праваахоўных органаў Беларусі. Калі інфармацыя, якая змяшчаецца ў іх, адпавядае рэчаіснасці, яна сведчыць не толькі пра інфармаванасць асобных службовых асобаў адносна існавання абмежаванняў, вызначаных артыкулам 3 Статута Інтэрпола, але і пра свядомыя спробы абыходу гэтых абмежаванняў праз змяненне кваліфікацыі абвінавачванняў, выбар фармулёвак запытаў і іншыя спосабы надання палітычна матываваным справам выгляду звычайнага крымінальнага пераследу. Падобная практыка несумяшчальная як з прынцыпам палітычнай нейтральнасці Інтэрпола, так і з фундаментальнымі прынцыпамі міжнароднага супрацоўніцтва ў крымінальна-прававой сферы.

Праведзенае даследаванне таксама выявіла шэраг структурных праблем у існуючай сістэме кантролю Інтэрпола. Нягледзячы на важную ролю Камісіі па кантролі за файламі Інтэрпола, асобы, якія сталі аб'ектамі апрацоўкі дадзеных, нярэдка сутыкаюцца з абмежаваным доступам да інфармацыі, працяглымі тэрмінамі разгляду зваротаў і немагчымасцю своечасова выбудаваць эфектыўную стратэгію абароны. У выніку многія заяўнікі вымушаныя звяртацца ў Камісію прэвентыўна, не маючы поўнай інфармацыі аб характары і змесце наяўных у дачыненні да іх звестак.

Беларускі вопыт апошніх гадоў дэманструе, што транснацыянальныя рэпрэсіі сталі адным з ключавых інструментаў беларускага рэжыму ў адносінах да грамадзян, якія знаходзяцца за межамі краіны. Пры гэтым наступствы падобных дзеянняў выходзяць далёка за межы асобных чалавечых лёсаў. Злоўжыванне механізмамі міжнароднага супрацоўніцтва падрывае давер да саміх міжнародных інстытутаў, ствараючы рызыку іх выкарыстання ў мэтах, якія прама супярэчаць задачам, для якіх яны былі створаны.

Захаванне даверу да сістэмы Інтэрпола патрабуе не толькі эфектыўнага рэагавання на асобныя выпадкі злоўжыванняў, але і гатоўнасці прызнаваць і ўстараняць сістэмныя рызыкі, якія ствараюць магчымасці для палітычна матываванага выкарыстання механізмаў міжнароднага паліцэйскага супрацоўніцтва. Такая паслядоўная мадэль паводзінаў патрабуе сістэмнага адказу з боку Інтэрпола, дзяржаў-членаў і міжнародных арганізацый.

Юрыдычны дэпартамент Офіса Святланы Ціханоўскай зыходзіць з таго, што абарона палітычнай нейтральнасці Інтэрпола і выкананне артыкула 3 яго Статута з'яўляюцца не толькі пытаннем інстытуцыйнай рэпутацыі арганізацыі, але і найважнейшай гарантыяй абароны тысяч людзей, якія былі вымушаныя пакінуць свае краіны з прычыны палітычных рэпрэсій. Міжнароднае супрацоўніцтва ў крымінальна-прававой сферы не павінна ператварацца ў інструмент пераследу за палітычныя перакананні, грамадзянскую актыўнасць, удзел у мірных пратэстах або падтрымку дэмакратычных пераўтварэнняў.

Дакументаваныя ў дадзеным дакладзе выпадкі паказваюць, што праблема злоўжывання міжнароднымі механізмамі з боку беларускага рэжыму застаецца актуальнай і патрабуе далейшай увагі з боку міжнародных партнёраў. Толькі паслядоўны кантроль, празрыстасць

працэдур і гатоўнасць рэагаваць на парушэнні здольныя забяспечыць, каб ніводзін чалавек не станавіўся аб’ектам міжнароднага пераследу выключна за рэалізацыю сваіх фундаментальных правоў і свабод.

## CALL TO ACTION

З улікам вышэйсказанага юрыдычны дэпартамент Офіса Святланы Ціханоўскай з павагай прапануе наступныя меры, накіраваныя на ўдасканаленне працы Інтэрпола, у прыватнасці ў дачыненні да запытаў, якія паступаюць ад рэпрэсіўных рэжымаў, такіх як беларускі.

Органам Інтэрпола прапануецца:

- ставіцца да дыфузій і запытаў аб выдачы «чырвоных апавяшчэнняў», якія паступаюць з Беларусі, з асаблівай асцярогай і крытычна ацэньваць іх ужо на пачатковым этапе атрымання адпаведнай інфармацыі ад Нацыянальнага цэнтральнага бюро ў Мінску;
- разгледзець магчымасць стварэння структураванага працэсу аўтаматычнай перадачы запытаў, якія паступаюць з Беларусі, у Камісію па кантролі за файламі Інтэрпола да іх распаўсюджвання па каналах Інтэрпола;
- разглядаць запыты, якія паступаюць ад беларускіх праваахоўных органаў у дачыненні да асоб, якія пакінулі Беларусь пасля 2020 года, праз прызму павышанай рызыкі палітычна матываванага пераследу;
- інфармаваць асоб, у дачыненні да якіх выпушчаны «чырвоныя апавяшчэнні» або дыфузіі, з тым каб яны маглі своечасова аспрэчыць апрацоўку дадзеных у Камісіі;
- забяспечыць выкананне тэрмінаў разгляду спраў у Камісіі, у тым ліку шляхам прадастаўлення сакратарыяту Камісіі дадатковых рэсурсаў, неабходных для эфектыўнага і своечасовага разгляду запытаў;
- публікаваць агрэгаваную статыстыку па колькасці запытаў, адхіленых або выдаленых у сувязі з парушэннем артыкула 3 Статута Інтэрпола, уключаючы дадзеныя па дзяржавах-ініцыятарах такіх запытаў;
- разгледзець пытанне аб увядзенні спецыяльнага рэжыму маніторынгу дзейнасці Нацыянальнага цэнтральнага бюро Інтэрпола ў Мінску, уключаючы рэгулярны аўдыт адпаведнасці яго запытаў артыкулу 3 Статута Інтэрпола і Правілам апрацоўкі даных;
- разгледзець пытанне аб прыняцці ў адносінах да Нацыянальнага цэнтральнага бюро Інтэрпола ў Мінску карэкцыйных мер, прадугледжаных Правіламі, уключаючы абмежаванне або прыпыненне доступу да асобных каналаў і інструментаў Інтэрпола ў выпадку працягу сістэмных злоўжыванняў.

Кампетэнтным органам дзяржаў прапануецца:

- значна ўзмацніць праверку ўсіх запытаў, дыфузій і іншых паведамленняў, якія паступаюць з Беларусі, улічваючы высокую рызыку іх палітычнай матывацыі;
- строга патрабаваць наяўнасці судовага рашэння ў якасці абавязковай умовы для разгляду такіх запытаў;
- не разглядаць наяўнасць судовага рашэння беларускага суда як дастатковае пацвярджэнне законнасці пераследу без дадатковай ацэнкі незалежнасці працэсу, захавання права на справядлівае судовае разбіральніцтва і магчымай палітычнай матывацыі справы;
- прымаць да ўвагі сістэмны характар парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі, зафіксаваны ў рамках мандатаў, устаноўленых Радай па правах чалавека Арганізацыі Аб'яднаных Нацый;

- улічваць наяўнасць міжнароднай абароны, гуманітарнага статусу, заявы аб прадастаўленні прытулку, удзелу ў дэмакратычным руху або іншых прыкмет палітычнага пераследу як істотныя фактары пры ацэнцы запытаў, якія паступаюць з Беларусі;
- строга выконваць прынцып невысылкі і заўсёды ацэньваць бяспеку магчымага вяртання з улікам бягучай сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, улічваючы, у прыватнасці, краінавыя рэкамендацыі, выпушчаныя Агенцтвам Еўрапейскага саюза па пытаннях прытулку і іншымі адпаведнымі міжнароднымі арганізацыямі.

Міжнародным партнёрам, уключаючы дзяржавы-сябры Інтэрпола, парламентарыяў, міжнародныя арганізацыі і праваабарончыя структуры, прапануецца:

- накіраваць у адрас Генеральнага сакратарыята Інтэрпола і Камісіі па кантролі за файламі Інтэрпола звароты з выказваннем занепакоенасці ў сувязі з сістэмным выкарыстаннем беларускім рэжымам каналаў Інтэрпола для транснацыянальнага пераследу палітычных апанентаў;
- заклікаць Інтэрпол правесці ацэнку дзейнасці Нацыянальнага цэнтральнага бюро Інтэрпола ў Мінску на прадмет адпаведнасці артыкулу 3 Статута Інтэрпола, Правілам апрацоўкі даных і абавязацельству дзейнічаць у духу Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека;
- узнімаць пытанне злоўжывання Беларуссю механізмамі Інтэрпола на двухбаковым і шматбаковым узроўнях, уключаючы пляцоўкі Еўрапейскага саюза, Рады Еўропы, АБСЕ, Арганізацыі Аб’яднаных Нацый і парламенцкай дыпламатыі;
- падтрымліваць беларусаў і беларусак, якія сталі ахвярамі палітычна матываваных запытаў, дыфузій, экстрадыцыйных працэдур ці іншых форм транснацыянальнага пераследу, у тым ліку праз юрыдычную дапамогу, маніторынг спраў і публічную адвакацыю;
- садзейнічаць павышэнню празрыстасці і падсправаздачнасці сістэмы Інтэрпола, каб міжнароднае паліцэйскае супрацоўніцтва не выкарыстоўвалася як інструмент палітычных рэпрэсій.

